*Я. А. ЮХО*

# КАНСТЫТУЦЫЯ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ 3-га МАЯ 1791 г. І БЕЛАРУСЬ

In 1791 the state reforms were introduced as part of the adoption of a constitution. Rzecz Pospolita had been a confederation made up by the Great Principility of Lithuania and Poland. There hadn't been centralized government in Rzeczpospolita and the King and the Sejm hadn't had real power. Under the Constitution of 1791 legislative power was vested in the Sejm and executive power was vested in the Cabinet with the King at the head. From then on the confederation became a single federal state. Two states amalgamated as one. The rights of the common people were expanded creating conditions for further progress within the state.

Юхо Язэп Аляксандравіч, доктар юрыдычных навук, прафесар кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права БДУ, лаўрэат прэміі імя У. І. Пічэты.

Аўтар больш за 150 навуковых прац, у тым ліку: «Крыніцы беларуска-літоўскага права», «Кароткі нарыс гісторыі дзяржавы і права Беларусі». Адзін з перакладчыкаў, каментатараў і рэдактараў перавыдання Статута Вялікага княства Літоўскага 1588 г.



Рэвалюцыйныя падзеі, што адбыліся ў Рэчы Паспалітай у апошнім дзесяцігоддзі XVIII ст. аказалі значны ўплыў на гістарычны лёс многіх еўрапейскіх народаў. Пачатак гэтым падзеям быў пакладзены заканадаўчымі актамі так званага Чатырохгадовага сойму, якім была ўхвалена «Устава жондова», атрымаўшая назву Канстытуцыі 3-га мая 1791 г. Гэтая канстытуцыя была выдатным дасягненнем дзяржаўна-прававой думкі таго часу. Яна грунтавалася не на нейкіх утапічных марах, а зыходзіла з рэальных палітычных і эканамічных адносін, ставіла перад народамі Польшчы, Беларусі, Літвы і часткі Украіны, што складалі Рэч Паспалітую, рэальныя заданні пабудовы дэмакратычнай дзяржавы на аснове грамадскага кампрамісу паміж прагрэсіўнай шляхтай і буржуазіяй, з аднаго боку, і феадаламі-прыгоннікамі, з другога. Але ў гэтым кампрамісе была і яе слабасць: радыкальныя дзеячы лічылі яе недастаткова прагрэсіўнай, бо яна захоўвала ўладу памешчыкаў над сялянамі, духоўную дыктатуру вярхоў каталіцкага духавенства над усім народам. Так, у 1793 г. Т. Касцюшка пісаў, што ў першую чаргу неабходна ліквідаваць прыгонную залежнасць сялян, абвясціць свабоду і роўныя правы для ўсіх, ліквідаваць засілле вярхоў каталіцкага духавенства, адмяніць каралеўскую ўладу. Рэакцыйныя колы наадварот лічылі, што Канстытуцыя 3 мая — гэта «рэвалюцыйная змова». У сувязі з гэтым і пры дапамозе расійскага ўрада Кацярыны II яны ў маі 1792 г. абвясцілі акт Таргавіцкай Канфедэрацыі і запрасілі на дапамогу расійскія войскі, каб знішчыць прагрэсіўныя перамены ў Рэчы Паспалітай.

Рэч Паспалітая як канфедэрацыя дзвюх дзяржаў — Польшчы і Вялікага княства Літоўскага — і чатырох народаў (беларускага, літоўскага, польскага і ўкраінскага) склалася пасля Люблінскай уніі 1569 г. Дзяржаўны лад гэтай канфедэрацыі будаваўся не па акту Люблінскай уніі, які прадугледжваў утварэнне унітарнай дзяржавы, а на аснове практыкі саюзных адносін, што мелі месца, пачынаючы з Крэўскай уніі 1385 г., а потым былі замацаваны ў Статуце Вялікага княства Літоўскага 1588 г. і генрыхаўскіх артыкулах. У артыкулах змяшчаліся асноўныя прынцыпы, што вызначалі абмежаванне каралеўскай улады паўнамоцтвамі сойма.

Упершыню яны былі распрацаваны пры абранні на прастол Генрыха Валуа ў 1574 г., але падпісаны пры каранацыі Стэфана Баторыя 30 мая 1576 г., і потым падпісваліся ўсімі каралямі Рэчы Паспалітай. У іх абвяшчаліся: свабоднае абранне караля, свабода хрысціянскага веравызнання, абавязак склікаць сойм раз у два гады на шэсць тыдняў; не склікаць пас-

палітае рушэнне (агульнае апалчэнне) без згоды сойма, мець пастаянны савет з 16 сенатараў-рэзідэнтаў. Забаранялася ўстанаўліваць новыя падаткі і пошліны без згоды сойма. Прадугледжвалася, што калі кароль будзе дзейнічаць насуперак праву і сваім абавязкам, то шляхта можа адмовіцца ад падпарадкавання і выступіць супраць яго. Кароль не валодаў ні заканадаўчай, ні выканаўчай, ні судовай уладаю. А для таго каб ён нічога сам не мог рабіць, пры ім пастаянна знаходзіліся не менш як 4 з 16 сенатараў-рэзідэнтаў.

Сойм Рэчы Паспалітай складаўся з пасольскай ізбы і сената, у які ўваходзілі ўсе каталіцкія архіепіскапы і епіскапы, ваяводы, кашталяны і некаторыя службовыя асобы вярхоўных органаў кіравання Польшчы і Вялікага княства Літоўскага (усяго каля 140—150 сенатараў). Пасольская ізба (палата дэпутатаў) складалася з выбраных прадстаўнікоў павятовай шляхты (200—250 чалавек). Па сутнасці, усімі справамі сойма кіравалі вярхі каталіцкага духавенства і некалькі сем'яў буйных землеўласнікаў-магнатаў, якія праз сваіх стаўленікаў кантралявалі выбары дэпутатаў на павятовых сойміках і накіроўвалі іх паводзіны на агульных (вальных) соймах.

Канфедэрацыйны характар Рэчы Паспалітай вызначаўся тым, што Статут 1588 г. юрыдычна замацаваў адасобленасць тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага, грамадзянства, заканадаўства, судовага і адміністрацыйнага ладу, арміі, фінансаў. Апрача таго, на агульных соймах кожны дэпутат меў права на любое рашэнне і на ўсю работу сойма накладаць забарону (liberum veto — свабоднае вета), што не дазваляла большасці навязваць сваю волю меншасці. Аднак неабмежаванае права «свабоднага вета» вяло да злоўжывання ім і бяссілля сойма. Апрача таго, усе дэпутаты з паветаў абавязаны былі дакладна прытрымлівацца інструкцый павятовых соймікаў, што, у сваю чаргу, забяспечвала адасобленасць і самастойнасць Вялікага Княства Літоўскага. Такім чынам, абмежаванасць улады караля і сойма Рэчы Паспалітай пры адсутнасці адзінага для ўсёй дзяржавы ўрада рабілі сувязі паміж Польшчай і Вялікім княствам Літоўскім вельмі слабымі. А адсутнасць адзінага ўрада давала магчымасць магнатам і вярхам каталіцкага духавенства беспакарана самавольнічаць і здзекавацца над народам, стрымліваць угрунтаванне новых сацыяльна-эканамічных адносін.

У другой палове XVIII ст. у Рэчы Паспалітай разгарнулася вострая палітычная барацьба прыхільнікаў рэформаў дзяржаўнага ладу з рэакцыйнымі коламі каталіцкага духавенства і магнатаў. Асабліва абвастрылася гэтая барацьба, калі на каралеўскі прастол быў абраны ўраджэнец Беларусі, пляменнік канцлера Вялікага княства Літоўскага Міхала Фрыдэрыка Чартарыйскага, Станіслаў Панятоўскі, якому на каранацыі было дадзена яшчэ імя — Аўгуст.

Рыхтуючы рэформы дзяржаўнага ладу, палітычныя дзеячы Рэчы Паспалітай у першую чаргу звярнулі ўвагу на канстытуцыйнае права, замацаванае Статутам 1588 г. Аб гэтым сведчыць выступленне караля Станіслава Аўгуста ў сойме 11 верасня 1776 г., у якім ён адзначыў, што Статут 1588 г. заслугоўвае самага справядлівага павагання, бо ім шчасліва і разумна карыстаюцца да гэтага часу грамадзяне Вялікага княства Літоўскага і многія ваяводствы Польшчы жадаюць, каб і для іх ён стаў правам, і пажадаў, «каб у Кароне дайшлі да такога шчасця, якім ганарыцца Літва»[1].

Праз увесь статут праводзіцца ідэя ўмацавання прававога парадку, пры якім усе дзяржаўныя органы і службовыя асобы павінны дзейнічаць толькі ў адпаведнасці з правам. Ідэя прававога парадку была накіравана найперш супраць дэспатызму буйных феадалаў і сярэдневяковай тэакратычнай тэорыі паходжання і сутнасці дзяржавы. Гэтая ідэя праявілася ў многіх артыкулах Статута 1588 г., а таксама была выкладзена Л. Сапегам у прысвячэннях статута Жыгімонту III Вазе і ўсім саслоўям Вялікага

княства Літоўскага. Ён пісаў: «для таго права суть поставлены, абы можнаму и потужному не всё было вольно чинити, яко Цицеро поведил, иж естесмо невольниками прав для того, абысьмы вольности уживати могли» — і далей Л. Сапега працягвае: «вольности своее во всем постерегаем бо не только сусед, а сполный наш обыватель в отчизне, але и сам господар пан наш жадное звирхности над нами заживати не можеть, одно только, колько ему право допущаеть» (Статут Вялікага княства Літоўскага 1588. Мн., 1989. С. 47).

Абвяшчэнне ідэі прававога парадку сведчыла аб зараджэнні новай дзяржаўнай тэорыі, якая ў поўнай меры адпавядала патрэбам нараджэння буржуазнага грамадства і атрымала ўвасабленне ў Канстытуцыі 3 мая 1791 г. і прынятых у гэтым жа годзе законах. У студзені былі зацверджаны *кардынальныя, нязменныя правы,* якімі гарантаваліся правы і прывілеі каталіцкай царквы, вечная унія паміж Польшчай і Вялікім княствам Літоўскім, абвяшчалася свабода слова і друку. У сакавіку быў прыняты закон аб павятовых сойміках, якім беззямельная шляхта пазбаўлялася права ўдзельнічаць у выбарах дэпутатаў сойма, а ў красавіку быў абвешчаны закон аб гарадах. Два апошнія законы былі прызнаны складанай часткай Канстытуцыі 3-га мая.

Канстытуцыя 3-га мая змяшчае прэамбулу і 11 раздзелаў. У прэамбуле ад імя караля Станіслава Аўгуста гаворыцца, што, улічваючы застарэлыя недахопы кіравання ў Рэчы Паспалітай і жадаючы выкарыстаць становішча, у якім знаходзіцца Еўропа, імкнучыся дасягнуць знешняй незалежнасці і ўнутранай свабоды народа для агульнага дабрабыту і захавання дзяржавы і яе граніц, зацвярджаецца гэтая канстытуцыя.

У першым раздзеле пануючай рэлігіяй у дзяржаве абвяшчалася «святая рымская каталіцкая» рэлігія. Пераход з каталіцкай веры ў іншую забараняўся, для ўсіх іншых рэлігій гарантавалася свабода выканання рэлігійных абрадаў.

Другі раздзел пацвярджаў усе правы і прывілеі шляхты Польшчы і Вялікага княства Літоўскага. У трэцім раздзеле зацвярджаўся закон аб гарадах і аб'яўляўся часткай канстытуцыі.

Чацвёрты раздзел змяшчаў новыя нормы аб сялянах. У ім гаварылася: «Сялян, з пад рук якіх цячэ вялікая крыніца багаццяў краіны, што складаюць у народзе самую шматлікую частку насельніцтва, і, значыць, з'яўляюцца дзейнай сілай краіны, па справядлівасці, з пачуцця чалавечнасці і хрысціянскага абавязку, а таксама ўлічваючы наш уласны, правільна зразумелы інтарэс, мы бярэм пад ахову права і нашага ўрада, устанаўліваючы, што з гэтага часу любыя свабоды, пажалаванні або сапраўдныя дагаворы, заключаныя між землеўладальнікамі і сялянамі іх маёнткаў, незалежна ад таго, ці былі яны зроблены з усёй грамадою або кожным асобным жыхаром вёскі, павінны ўстанаўліваць агульныя і ўзаемныя абавязацельствы ў адпаведнасці з дакладным значэннем умоў і запісанага ва ўказанных пажалаваннях і дагаворах, якія знаходзяцца пад апекай краявога ўрада». У дадзеным раздзеле зроблена спроба, хоць бы на словах, крыху абмежаваць свавольства паноў у адносінах да сялян, бо сама залежнасць іх ад паноў не скасоўвалася.

Пяты раздзел замацоўваў прагрэсіўнае палажэнне аб тым, што «усякая ўлада ў чалавечым грамадстве бярэ свой пачатак з волі народа» і павінна складацца з трох уладаў, г. зн. заканадаўчай, выканаўчай і судовай.

Шосты раздзел вызначаў структуру і паўнамоцтвы дзвюхпалатнага сойма, які зацвярджаўся ў складзе палаты дэпутатаў (паслоў) і палаты сенатараў пад старшынствам караля. Палата дэпутатаў абвяшчалася святыняй заканадаўства, тут павінны былі абмяркоўвацца ўсе заканапраекты. Сенат, які складаўся з каталіцкіх епіскапаў, ваяводаў, каштэлянаў і міністраў пад старшынствам караля мог ухваліць або адкласці да паўторнага пасяджэння сойма закон, прыняты ў палаце дэпутатаў. У выпадку адкладання палаты збіраліся разам і рашэнне прымалася простай

большасцю галасоў. Гэтым раздзелам адмянялася liberum veto, уст: наўлівалася, што канстытуцыя падлягае перагляду толькі праз 25 гадоў.

Па-новаму вырашалася і пытанне аб выканаўчай уладзе — урадзе, састаў кампетэнцыя якога вызначаліся ў раздзеле сёмым. Вышэйшым выканаўчы органам — урадам — абвяшчалася Стража правоў. У састаў урада ўваходзіл кароль як старшыня; кіраўнік каталіцкай царквы — прымас як старшыня ка місіі народнай асветы і пяць міністраў: паліцыі, унутраных і замежных спраў ваенны, фінансаў. Назначаліся два сакратары, з якіх адзін вёў справаводств Стражы правоў, другі — замежныя справы. Міністраў прызначаў кароль.

Да найбольш важных змяненняў адносілася адмена выбарнасці карал: і ўстанаўленне спадчыннасці трона. Кароль надзяляўся шырокім паўнамоцтвамі. Ён прызнаваўся вярхоўным галоўнакамандуючым узброеных сіл дзяржавы, прызначаў і звальняў генералаў і афіцэраў, службовых асоб органаў дзяржаўнага кіравання, сенатараў, епіскапаў. Аднак усе акты караля засведчаліся подпісам адпаведнага міністра, які і адказваў перад соймам за дадзены акт, паколькі канстытуцыяй асоба караля абвяшчалася «свяшчэннай і ў бяспецы ад усяго. Нічога сам адзін не прымае, ні за што ў адказе перад народам быць не можа». У выпадку, калі ніводзін з міністраў не згодзіцца падпісаць рашэнне, кароль адступіць ад гэтага рашэння, а калі будзе настойваць, то пытанне пераносіцца на вырашэнне сойма. Для незалежнага функцыянавання выканаўчай улады прадугледжвалася стварэнне пры ўрадзе пастаянных камісій. Камісіі па асвеце, паліцыі, ваенная, фінансаў выбіраліся соймам; раней створаныя ваяводскія камісіі парадку падлягалі ўрадаваму нагляду.

Стварэнне адзінага ўрада для ўсёй Рэчы Паспалітай павінна было змяніць характар дзяржаўнага ладу, ператвараючы канфедэрацыю ў федэрацыю, садзейнічаць цэнтралізацыі дзяржавы, умацаванню аўтарытэту цэнтральных органаў улады і кіравання, абмяжоўваць усемагутнасць і свавольства буйных феадалаў.

Істотныя змяненні ўносіліся ў структуру і характар дзейнасці судовых органаў (раздзел 8). Абвяшчаўся прынцып ажыццяўлення правасуддзя толькі судом. Тым самым павінны былі быць унесены некаторыя змяненні ў Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 г. Згодна з канстытуцыяй ліквідаваўся суд гаспадара і паноў рады, але захоўваўся галоўны суд Вялікага княства Літоўскага. Суды адносіліся да першай ці другой інстанцыі. Суды першай інстанцыі замест сесійнага разгляду спраў павінны былі стаць пастаяннымі і разглядаць справы на працягу года. Ствараліся рэферэндарскія суды для свабодных сялян, а таксама вышэйшы суд, называемы соймавым. У гэтым судзе павінны былі разглядацца крымінальныя справы па дзяржаўных злачынствах супраць народа і караля. Канстытуцыяй прадпісвалася выдаць новы кодэкс па цывільных і крымінальных справах. Усе суды па-ранейшаму заставаліся саслоўнымі, а залежных сялян працягвалі судзіць іх паны.

У дзевятым раздзеле вызначаўся парадак прызначэння рэгента на выпадак хваробы, палону або непаўналецця караля; дзесяты раздзел вызначаў асаблівасці вучобы дзяцей караля і нагляду за іх выхаваннем.

Апошні, адзінаццаты, раздзел канстытуцыі прысвячаўся ўзброеным сілам, якія павялічваліся ў некалькі разоў і складаліся са шляхецкага апалчэння і рэкрутаў з сялян. Армія падпарадкоўвалася выканаўчай уладзе і павінна была прысягаць на вернасць народу і каралю, на абарону дзяржаўнай канстытуцыі.

Канстытуцыя 3-га мая была прынята ў выніку вострай палітычнай барацьбы. Яна захоўвала феадальна-прыгонніцкі лад і адначасова стварала больш выгадныя ўмовы для развіцця мануфактурнай вытворчасці і гандлю, надзяляла больш шырокімі правамі гарадскіх жыхароў — мяшчан. Канстытуцыя ўнесла карэнныя змяненні ў структуру вышэйшых органаў улады: сойм павінен быў стаць сапраўды заканадаўчым органам, у Рэчы Паспалітай была зроблена спроба ажыццявіць прынцып

парламенцкага способу кіравання. Для свайго часу Канстытуцыя 3 мая мела прагрэсіўнае значэнне, але яе палажэнні не былі поўнасцю ажыццёўлены з-за мецяжу рэакцыйных колаў, якія абвясцілі вясной 1792 г. у мястэчку Таргавіца (Украіна) вайну свайму ўраду і запрасілі на дапамогу замежныя дзяржавы. Царскі ўрад Расіі 18 мая 1792 г. накіраваў у Рэч Паспалітую 100-тысячную армію, што прывяло да хуткай перамогі таргавічан.

Выклікаўшы ваенны разгром Рэчы Паспалітай, таргавічане садзейнічалі і яе другому падзелу, бо ў студзені 1793 г. Прусія дамовілася з Расіяй аб аддзяленні ад Рэчы Паспалітай часткі тэрыторый. Да Расіі адыйшла частка Беларусі з Мінскам, Барысавам, Слуцкам, Пінскам, Мазыром і некаторыя раёны Заходняй Украіны, а да Прусіі — спрадвечна польскія землі з гарадамі Торунем, Гданьскам, Познанню. Сойм Рэчы Паспалітай, які сабраўся 17 чэрвеня 1793 г. у Гародне, прызнаў гэтыя тэрытарыяльныя страты. У ходзе гэтай сесіі сойма было абвешчана аб роспуску таргавіцкай і стварэнні гарадзенскай канфедэрацыі, была адменена Канстытуцыя 3 мая і зацверджана новая канстытуцыя.

Згодна з гарадзенскай канстытуцыяй 1793 г. Вялікае княства Літоўскае захоўвала сваю дзяржаўную самастойнасць, адасобленасць тэрыторыі, свае права, армію, сваю судовую сістэму. Па гэтай канстытуцыі аднаўлялася Неадменная рада, якая ўтваралася з прадстаўнікоў Польшчы і Вялікага княства на парытэтнай аснове. Але і гэтая канстытуцыя не была ўведзена ў дзеянне, бо ўжо ў весну 1794 г. пачалося паўстанне пад кіраўніцтвам Андрэя Тадэвуша Касцюшкі, і Вялікае княства Літоўскае стала арэнай ваенных дзеянняў.

Падсумоўваючы нашы разважанні аб Канстытуцыі 3-га мая, адзначым наступнае. У польскай і нашай гістарычнай літаратуры апошняга часу пашырылася памылковая думка, што, нібыта, з прыняццем Канстытуцыі 1791 г. была ліквідавана дзяржаўнасць Вялікага княства Літоўскага і Рэч Паспалітая ператварылася ва унітарную дзяржаву. На самой жа справе мелася толькі ў будучым ператварыць канфедэрацыю дзвюх дзяржаў у федэрацыю. Аб гэтым сведчаць наступныя факты: згодна з «узаемнай дамовай абоіх народаў», што адбылася пасля прыняцця канстытуцыі, прадстаўнікам Вялікага княства Літоўскага гарантаваўся ўдзел на парытэтных пачатках ва ўсіх сумесных вышэйшых органах дзяржаўнага кіравання; захоўвалася адасобленая судовая сістэма з Галоўным трыбуналам Вялікага княства Літоўскага; захоўвалася свая прававая сістэма і дзейнасць Статута 1588 г.; заставаліся без усялякіх змен ваяводскія і павятовыя органы ўлады, на пасады ў якія маглі прызначацца толькі мясцовыя шляхцічы. Да гэтага трэба дадаць, што з пачаткам паўстання ў Вялікім княстве Літоўскім 24 красавіка 1794 г. у Вільні была ўтворана *Найвышэйшая Рада Вялікага княства Літоўскага* як вышэйшы орган рэвалюцыйнай улады для ўсяго княства. Усё гэта сведчыць аб тым, што і пасля прыняцця майскай канстытуцыі Вялікае княства Літоўскае захоўвала сваю дзяржаўную адасобленасць у складзе Рэчы Паспалітай, якая знаходзілася ў становішчы пераходу ад канфедэрацыі да федэрацыі.

Канстытуцыя 1791 г. — гэта першая спроба карэннай рэформы дзяржаўнага ладу Рэчы Паспалітай, праведзеная зверху, без крыві, без пік і тапароў. Яна засведчыла, што справа незалежнасці дзяржавы неадлучна звязана з сацыяльнымі рэформамі, асабліва з сялянскай рэформай.

Адам Міцкевіч пісаў у 1833 г. пра Канстытуцыю 3-га мая: «...гэты закон не выйшаў з галавы адзінокага мудраца, з вуснаў некалькіх прамоўцаў, але здабыўся цалкам з сэрца вялікай масы; ён існуе не толькі на паперы, але жыве да гэтага часу ў памяці, у памкненнях пакаленняў; ён з'яўляецца законам жывым, карані якога ў мінулым і здольны развівацца ў будучым»[2].

[1] Bardach J. O dawnej i niedawnej Litwie. Poznan, 1988. S. 67.

[2] Мицкевич А. // Избранные произведения прогрессивных польских мыслителей. М., 1956. Т. 2. С. 285.